ШЧАСЛІВАГА НОВАГА ГОДА!



ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Беларускі універсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 37 (1187) ● 29 снежня 1977 г. Цана 2 кап.

Партыйнае жыццё

З вялікім уздымам

Рашэнні снежаньскага (1977 г.) Пленума ЦК КПСС і восьмай сесіі Вярхоўнага Савета СССР з'яўляюцца баявой праграмай дзейнасці партыі і народа па здзяйсненню планаў пяцігодкі, рашэнняў XXV з'езда КПСС. Камуністы, камсамольцы, усе савецкія людзі імкнуцца глыбей авалодаць гэтай праграмай, канкрэтна вызначыць сваю ролю, асабісты ўклад кожнага ў барацьбу за яе паспяховую рэалізацыю.

Рашэнні снежаньскага (1977 г.) Пленума ЦК КПСС, восьмай сесіі Вярхоўнага Савета СССР і задачы партарганізацый ужо абмеркавалі камуністы выдавецтва і друкарні, адміністрацыйна-гаспадарчай часткі і іншых партарганізацый падраздзяленняў БДУ.

Універсітэт перадсвяточны

Арыенцір — рашэнні з'езда

Партком універсітэта разгледзеў пытанне «Аб рабоце партыйнай арганізацыі юрыдычнага факультэта па павышэнню адказнасці камуністаў за выкананне патрабаванняў Статута партыі ў святле рашэнняў XXV з'езда КПСС».

З дакладам выступіў сакратар партарганізацыі юрфака В. Ціхіня. Ён адзначыў, што камуністы факультэта правялі значную работу па растлумачэнню праекта новай Канстытуцыі СССР. Актыўны ўдзел у прапагандысцкай рабоце прымаюць В. Чыгір, А. Галаўко, А. Дулаў, М. Юркевіч, Я. Тагуноў і многія іншыя. Восемдзесят шэсць студэнтаў-камуністаў працуюць на грамадскіх пачатках у праваахоўных органах рэспублікі. У сістэме мер па павышэнню адказнасці камуністаў за выкананне Статута партыі вялікая ўвага ўдзяляецца ідэйнай загартоўцы членаў партарганізацыі. На факультэце працуе тры тэарэтычныя семінары, створан савет па рабоце з маладымі камуністамі, рэгулярна праводзяцца заняткі па вывучэнню Праграмы і Статута КПСС, арганізуюцца сустрэчы з ветэранамі вайны і працы (толькі ў гэтым годзе такіх сустрэч было чатыры).

Праводзімая партбюро, усімі камуністамі работа па павышэнню ўзаемнай патрабавальнасці і з'яднанню калектыву станоўча адбіваецца на стане вучэбна-выхаваўчага працэсу на факультэце. Разам з тым на пасяджэнні быў выяўлен шэраг недапрацовак. Партком універсітэта прыняў па разгледжанаму пытанню пастанову.

С. ІВАНОВА.

Навуковая сесія

Ва універсітэце прайшла навуковая сесія, прысвечаная 100-годдзю вызвалення Балгарыі ад атаманскага іга. Сесію адкрыў прарэктар БДУ па навуковай рабоце акадэмік АН БССР Л. Валадзько.

З дакладамі выступілі Д. Мельцар, прафесар БДУ, Г. Сяргеева, навуковы супрацоўнік АН БССР, І. Аржахоўскі, загадчык кафедры БДУ, Ніл Гілевіч, член прэзідыума Саюза пісьменнікаў БССР, аспірант універсітэта В. Мацэль.

У рабоце сесіі прынялі ўдзел выкладчыкі і студэнты БДУ, балгарскія стажоры.

П. ТАЦЦЯНІЧАВА.

...І стварылі дыскатэку

Хтосьці прапанаваў арганізаваць на біяфаку дыскатэку. Чыя была ідэя — ужо не памятаюць. І гэта зусім не так важна. Камітэт камсамола прапанову падтрымаў і нават абяцаў дапамагчы.

Калі гаварыць шчыра, складанасці ўзніклі з узнікненнем самой ідэі. Многія не верылі: куды нам дыскатэка, калі больш простыя мерапрыемствы і справы арганізуем з цяжкасцю. Даводзілася шмат спрачацца, даказваць, пераконваць. Нягледзячы ні на што, усё ж такі рызыкнулі і стварылі дыскатэку.

Цяпер на факультэце другі год пастаянна працуе студэнцкі дыскклуб. І трэба сказаць, ён выклікае вялікую цікавасць сярод тых студэнтаў, якія пасапраўднаму захапляюцца музыкай.

Часцей за ўсіх арганізуюць і праводзяць дыскатэкі Алег Мірашнічэнка і Сяргей Гілевіч, вялікія аматары і знаўцы сучаснай музыкі. Рабяты па-сапраўднаму зацікаўлены сваёй справай і аддаюць ёй шмат сіл і часу. Напэўна таму кожная арганізаваная імі дыскатэка — гэта не толькі знаёмства з новай музыкай, але і падрабязнае знаёмства з гісторыяй яе стварэння, з лёсам кампазітараў.

— Вечары ў клубе намнога ўзбагачаюць нас, — гавораць члены дыскклуба. — Акрамя таго, тут можна прыемна адпачыць, карысна правесці свой вольны час.

Дыскклуб на біяфаку сябе апраўдаў. Думаецца, што і іншыя факультэты зацікавяцца гэтай перспектыўнай формай арганізацыі вольнага часу студэнтаў.

А. ЛАПЦЁНАК.

Сустрэча з Янкам Брылем

Яна адбылася на філалагічным факультэце. У госці да студэнтаў прыйшоў аўтар, добра знаёмы моладзі, любімы ёю. Янка Брыль расказаў аб рабоце над творамі «Ніжнія Байдуны» і «Я з вогненнай вёскі», падзяліўся планамі на будучае, адказаў на пытанні студэнтаў. З разглядам тых або іншых аспектаў творчай лабараторыі пісьменніка на вечары выступілі В. В. Казлова, загадчыца кафедры беларускай літаратуры, Алег Лойка, прафесар і У. А. Навумовіч, кандыдат філалагічных навук.

Т. ПАЗНЯКОВА.

Уходзіць у мінулае год 1977-ы. Добры быў гэты год, багаты на падзеі. Мы абмяркоўвалі артыкулы Асноўнага Закона краіны, галасавалі за яго прыняцце. Новая Канстытуцыя СССР дала магутны творчы імпульс для развіцця працоўнай і палітычнай актыўнасці ўсіх савецкіх людзей у барацьбе за паспяховае выкананне рашэнняў XXV з'езда КПСС. Пройдуць гады, але дзень 7 кастрычніка 1977 года, калі вышэйшы орган дзяржаўнай улады прыняў новую Канстытуцыю СССР, назаўсёды ўвойдзе ў біяграфію нашай Радзімы, зойме ганаровае месца на старонках календароў.

Высокі сэнс мае гэтая падзея яшчэ і таму, што адбылася яна ў год юбілею Савецкай краіны. Роўна шэсць дзесяцігоддзяў назад у выніку пралетарскай рэвалюцыі ўзнікла першая ў свеце дзяржава рабочых і сялян.

Усе свае мары, планы і поспехі прысвяцілі мы 60-годдзю Вялікага Кастрычніка.

Юбілейны год... Выразную характарыстыку даў яму Л. І. Брэжнеў на XVI з'ездзе прафсаюзаў: «Юбілейны год — гэта заўсёды год успамінаў, год падвядзення вынікаў. Але мы, камуністы, азіраемся назад не толькі для таго, каб з законным гонарам адзначыць маштабнасць, гістарычную значнасць зробленага. Мы ўспрымаем мінулае як багацейшы рэзервуар вопыту, як матэрыял для роздумаў, для крытычнага аналізу асабістых рашэнняў і дзеянняў. Мы чэрпаем з мінулага натхненне для сённяшніх і будучых спраў».

І зараз, калі мы стаім на прыступцы новага — 1978 года—мы гаворым: хай ён будзе такім жа добрым, руплівым і плённым, як год мінулы.

Мы віншуем шматтысячны калектыў універсітэта з надыходзячым святам і жадаем студэнтам, супрацоўнікам, выкладчыкам здзяйснення ўсіх навагодніх мар, а таксама поспехаў у вучобе і працы!

ХІМФАК ПАДВОДЗІЦЬ ВЫНІКІ

Набліжаецца Новы, 1978 год. Усе факультэты нашага універсітэта падводзяць вынікі мінулагодняй работы, намячаюць планы на будучае. Днямі мы пабывалі на хімфаку і папрасілі намесніка дэкана Віктара Васільевіча Самахвала адказаць на нашы пытанні.

— Віктар Васільевіч, скажыце, калі ласка, чым быў знамянальны для Вашага факультэта мінулы год?

— Галоўная падзея — гэта прымяненне на нашым факультэце новага вучэбнага плана, які быў распрацаван выкладчыкамі і зацверджан Міністэрствам вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР. Хочацца адзначыць, што такога роду план упершыню распрацаван для хімфакаў нашай краіны.

— У чым жа навізна гэтага плана?

— Тут удзяляецца больш увагі вучэбнаму працэсу як на вытворчым аддзяленні, так і на педагагічным. Уведзены новыя дысцыпліны: інжынерная графіка, эканоміка арганізацыі прамысловасці, асновы навукова-тэхнічнай інфармацыі і інш. Для будучых педагогаў мы ўвялі абавязковую піянерскую практыку — работу ў піянерскіх лагерах. Для гэтай мэты на факультэце пачалі выкладаць новую дысцыпліну.

— Скажыце, а як Вашы студэнты спраўляюцца з новай праграмай?

— Адзначу, што 1-я група III курса заняла другое месца сярод акадэмічных груп універсітэта. Увогуле факультэт займае адно з першых месц па паспяховасці сярод прыродазнаўчых факультэтаў. За зімовую і летнюю сесіі паспяховасць студэнтаў склала 93 працэнты.

У нас створана «Кніга гонару», куды будуць заносіцца імёны ўсіх выдатнікаў факультэта.

— Віктар Васільевіч, як абстаяць справы з навуковай работай студэнтаў?

— У нас у студэнцкім навуковым таварыстве ўдзельнічаюць 450 студэнтаў. Яны пішуць навуковыя работы, якія знаходзяць затым прымяненне ў народнай гаспадарцы краіны. Каб не быць галаслоўным, прывяду некаторыя лічбы: 35 работ ужо ўкаранёны ў вытворчасць, у сааўтарстве са студэнтамі апублікаваны ў розных спецыяльных выданнях 45 навуковых работ, 52 дыпломныя работы студэнтаў-выпускнікоў рэкамендаваны для ўкаранення ў вытворчасць. Тры навуковыя работы былі адзначаны граматамі Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР і Усесаюзнага хімічнага таварыства імя Д. І. Мендзялеева.

Нядаўна выйшла пастанова стварыць пры універсітэце навукова-даследчы інстытут па праблемах цэлюлозы і бессярэбранага метаду атрымання вытворчых фотатавараў.

— Віктар Васільевіч, што б Вы хацелі пажадаць факультэту ў новым годзе?

— Хацелася б бачыць свой факультэт больш расшыраным у плошчы, мець на хімфаку сваю бібліятэку. Жадаю таксама студэнтам здаць гэтую зімовую сесію толькі на выдатна і добра.

В. ЧАРНУШЭНКА,
В. ШОЛАХАЎ,
студэнты II курса журфака.

Т. ПОЛЕТАЕВА

Это было, это было:
Мишурой рассвечен свод.
Я смеялась, я кружилась
В ночь на Старый Новый год.
Ты меня в толпе заметил:
«Ты откуда!» — и застыл.
— Я из прошлого столетья,
Там не принято на «ты».

— Ах, простите! Я — Виталик.
Как там, в тыща восемьсот..!
А меня гусары ждали,
Не справляли Новый год.
Перессорились, судача,
И уста ввели во грех.
А чужой забавный мальчик
Не пускал в ушедший век.

Это было, это было:
Как часы его спешат!
И теперь я не забыла,
До сих пор стоит в ушах:
«Ну скажи мне — я останусь,—
Ну шагни на век вперед,
Или я на век отстану
И явлюсь в твой Новый год».

Да XI Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў у Гаване

Хелена Маркевіч займаецца зараз на V курсе філалагічнага факультэта нашага універсітэта. Яна прыехала ў СССР з Польшчы ў 1974 годзе. Займалася дзяўчына ва універсітэце імя М. Фрунзе ў Сімферопалі. Затым пераехала ў сталіцу Беларусі. Тут перад ёю гасцінна адкрыліся дзверы Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.

Амаль два гады займаецца Хелена ў БДУ. За гэты параўнальна кароткі час яна пасябравала са студэнтамі сваёй групы. Шчырая, сардэчная дружба звязвае яе з савецкай студэнткай Людмілай Чырскай.

БДУ СТАЎ РОДНЫМ ДОМАМ

У вольны ад заняткаў час любіць Хелена гуляць па вуліцах і парках горада. Ёсць у яе і любімае месца — гэта парк імя Янкі Купалы. Больш за ўсё падабаецца дзяўчыне від з маста на раку Свіслач і на оперны тэатр. Для яе гэта — цепаўторны, жывы малюнак, дзе зліваецца ў адно цэлае прырода і архітэктура.

...Хутка бяжыць час. Не заўважыць Хелена, як наступіць пара развітвацца з нашай краінай, з блізкімі сябрамі, з дарагім ужо Мінскам, з універсітэтам.

Яна марыць вярнуцца на Радзіму і перадаць тыя веды, якія набыла ў Савецкім Саюзе, студэнтам і школьнікам Польшчы.

На ўсё жыццё застануцца ў памяці польскай студэнткі беларускія піянеры з чырвонымі гальштукамі. Хелена любіць іх вясёлыя песні, бадзёры настрой, дапытлівасць.

З цеплынёй, павагай і гарачымі словамі падзякі гаворыць яна пра сваіх выкладчыкаў, пра іх добрыя адносіны да студэнтаў розных краін і ў тым ліку да яе, студэнткі з Польшчы.

М. ДАБЖЫНСКАЯ.

КАНТАКТ — ТВОРЧЫ!

У мінулым годзе гісторыю замежнай літаратуры на нашым курсе чытала малады выкладчык філфака Таццяна Уладзіміраўна КАВАЛЁВА. Мне падабаліся яе лекцыі, змястоўныя і ў той жа час жывыя, непасрэдныя; яны былі падобныя на задушэўныя зносіны з добрым і ведаючым чалавекам.

— Таццяна Уладзіміраўна, як Вы сталі выкладчыкам?

— Вельмі проста і звычайна. Скончыла філалагічны факультэт БДУ, потым аспірантуру, абараніла кандыдацкую дысертацыю і вось другі год чытаю лекцыі па замежнай літаратуры.

— Як Вы рыхтуецеся да лекцый?

— Спачатку чытаю ўсё, што магчыма па данай тэме. Потым адбіраю найбольш цікавы, характэрны матэрыял. Мая задача — падкрэсліць мастацкія асаблівасці творчасці кожнага пісьменніка, каб не атрымалася так, што Сервантэс падобны на Шэкспіра. Каб зацікавіць студэнтаў, трэба, па-мойму, часцей звяртацца да арыгінальнага тэкста, хаця часу звычайна на ўсё не хапае.

Павінна сказаць, што мая мара — чытаць праблемныя лекцыі, але пакуль гэта рэдка атрымліваецца, бо ў мяне мала ўмення і вопыту. Акрамя таго, такія лекцыі маюць на ўвазе падрыхтаванасць аудыторыі. Я лічу, што студэнты таксама павінны рыхтавацца да лекцый.

Аднак нават самы добры змест цмянее без адпаведнай формы: свабоднай, эмацыянальнай. Гэта ідэал, і пакуль я толькі імкнуся да яго. На кожную лекцыю складаю план, бо зачытваць матэрыял — значыць губляць кантакт з аудыторыяй, або, як гавораць матэматыкі, зваротную сувязь.

— Празвінеў званок: якую манеру пачатку лекцыі Вы выбралі?

— Гэта залежыць ад аудыторыі. Бывае, студэнты гатовы да ўспрымання, застаецца толькі прыступіць да лекцыі. А калі аудыторыя шумная і непаседлівая, хвілін пяць даводзіцца траціць на тое, каб сканцэнтраваць агульную ўвагу. Гэтаму вельмі перашкаджаюць аматары спазняцца.

— Ці належыць, па-Вашаму, часам «разраджаць» абстаноўку на лекцыі?

— Канешне. Бо студэнты ў час лекцый стамляюцца, і тут умелая разрадка вельмі дарэчы. Але для гэтага трэба валодаць вялікім тактам, талентам педагога.

— Ці было ў Вашай практыцы такое, што аудыторыя выходзіла з-пад кантролю? Што Вы рабілі ў такіх выпадках?

— Бывала... У такіх выпадках я звычайна замаўкаю: гэта дзейнічае нават на асабліва захопленых размовай. Часам прыходзіцца рабіць лірычныя або нелірычныя адступленні. Пасля лекцыі я доўга перажываю, што штосьці ўпусціла.

— У час лекцыі Вы звяртаецеся да ўсёй аудыторыі ці да якой-небудзь пэўнай асобы?

— Адкрыць вам маленькі сакрэт? Звычайна я намячаю сабе невялікую групу, пяць-шэсць рабят, якія асабліва ўважліва слухаюць. Мой выбар не заўсёды апраўдваецца на экзаменах, але мне гэта дапамагае: па іх я правяраю ўражанне ад лекцыі, рэакцыю аудыторыі.

— Вы маладая. Не складае гэта цяжкасцей пры арганізацыі кантакту з аудыторыяй?

— Наогул, так. Неяк цяжка заваяваць і ўтрымаць увагу, вельмі патрэбную выкладчыку. Згадзіцеся, нават чыста знешняя розніца паміж салідным прафесарам і мной не ў маю карысць.

Але ў гэтым ёсць і свае плюсы. Мне вельмі блізкае і знаёмае студэнцкае асяроддзе, у прыватнасці ўсемагчымыя ўлоўкі тых, хто спісвае,— адзіных людзей, да якіх я бязлітасная.

— І апошняе пытанне — чым быў знамянальны для Вас год 1977-ы?

—...Я толькі пачала працаваць, у мяне яшчэ мала вопыту. Але за год працы прыбавілася ўпэўненасці. Я стала больш свабодна валодаць тэмай, бачыць аудыторыю — да апошняга студэнта.

А зараз мая мара — дабіцца паўнацэннай «зваротнай сувязі»— толькі такі кантакт паміж студэнтамі і выкладчыкам прыносіць сапраўднае задавальненне і тым, і другім.

— Дзякуй за размову.

Г. ПРЫХОДЗЬКА,
студэнтка II курса журфака.

ТАЛЕНТ ВЫСОКІ І МУДРЫ

У глыбіні сцэны юпітэры высвечваюць старонкі разгорнутай кнігі, якая абапіраецца на вялікае вострае пяро.

Вядучы творчага вечара Кандрата Крапівы, які адбыўся на днях у тэатры Я. Купалы, вучань народнага пісьменніка, лаўрэат Дзяржаўных прэмій рэспублікі А. Макаёнак гаварыў аб меткім, простым і мудрым слове сатырыка.

Распахнуліся дзверы залы, і да сцэны накіраваўся шумны натоўп персанажаў твораў К. Крапівы.

У выкананні артыстаў тэатра імя Я. Купалы гучаць частушкі на тэксты К. Крапівы, яго байкі і вершы, главы з рамана «Мяздзведзічы». Ажываюць на сцэне фрагменты п'ес «Партызаны», «Канец дружбы», «Мілы чалавек», «Людзі і д'яблы», «Хто смяецца апошнім», «Брама неўміручасці».

Да мікрафона падыходзіць К. Крапіва.

— Я лічу сябе шчаслівым чалавекам, таму што мая праца хоць у якойсьці меры дапамагла вялікай стваральнай рабоце нашага народа, — гаворыць ён. — Я шчаслівы, што маё сатырычнае пяро дапамагло партыі ў яе барацьбе за новага чалавека, за светлыя ідэалы будучага. Узрост утрымлівае мяне ад паспешных абяцанняў, але адпачываць на лаўрах я не збіраюся.

Апошнія словы пісьменніка патанулі ў громе апладысментаў. Гледачы дораць яму букеты чырвоных гваздзік.

Фота В. АЛІСЕВІЧА.

На шляху да мары

Я здзівілася ў першы момант. Побач са студэнтамі ў белых халатах спяшаліся, не звяртаючы ні на каго ўвагі, школьнікі. Заходзілі ў аўдыторыі, гарталі канспекты.

Так пачалося знаёмства са школай «Юны біёлаг».

...Чарнявая дзяўчына на апошняй парце — Жэня Ярашэвіч, дзесяцікласніца, у школе «Юны біёлаг» займаецца ўжо другі год.

— Хачу стаць біёлагам. Навука пакарыла сваёй сучаснасцю. Шмат у ёй нявырашаных праблем. Гэта ж цікава...

Дзяўчынка насупраць паглыбілася ў канспекты.

— А вас што, апытваюць? — не стрымалася я.

— Не. Але ў нас, акрамя тэарэтычных заняткаў, ёсць і практычныя. Без тэорыі якая практыка!

— Не сумуеце на лекцыях?

Дзяўчаты так паглядзелі на мяне, што я зразумела: пытанне было лішнім.

Пачалася лекцыя. Тэма — сардэчна-сасудзістая сістэма чалавека. 30 вучняў уважліва слухаюць выкладчыка. Штосьці адкрываюць для сябе. Пазнаюць. Вучацца.

...Алена Сямёнаўна Шалапёнак ужо пяты год з'яўляецца дырэктарам школы. Сярод сённяшніх студэнтаў біяфака БДУ нямала тых, хто пачынаў свой шлях у біялогію іменна тут.

— Алена Сямёнаўна, з якой мэтай створана школа? Ці толькі дзеля таго, каб падрыхтаваць школьнікаў да паступлення ў ВНУ?

Кожны год у нас займаюцца больш за 120 чалавек, у асноўным гэта вучні 9—10-х класаў. Аднак ёсць рабяты, што прыходзяць да нас з 8-га класа. Вядома, два гады вучобы ў школе — тэрмін вялікі. За гэты час можна праверыць правільнасць свайго выбару. (Кожны год частка рабят «адсейваецца»). Ну, а калі гаварыць пра веды, то, бясспрэчна, рабяты атрымліваюць добрую падрыхтоўку. Большасць з іх паспявае за гэты час выбраць сабе і спецыялізацыю. Гэта вельмі важна.

— Якія метады выкарыстоўваеце Вы ў сваёй рабоце?

— Трэба сказаць, што гэтыя метады падказваюцца самім жыццём. Мы чытаем лекцыі не толькі па школьнай праграме; імкнемся як мага шырэй і глыбей пазнаёміць рабят з біялогіяй і яе праблемамі. Кожная з васьмі кафедр распрацоўвае па некалькі тэм. Гэта дазваляе даць школьнікам уяўленне аб многіх галінах біялогіі. Штогод у нас праводзяцца канферэнцыі. Рабяты самастойна распрацоўваюць тэмы, абмяркоўваюць даклады, вучацца самастойна працаваць, аналізаваць. Па-мойму, іменна тут у нейкай ступені вырашаецца важная праблема — праблема скарачэння часу ў працэсе падрыхтоўкі будучага спецыяліста.

Т. МАНЁНАК.

1 студзеня 1959 года перамагла кубінская рэвалюцыя.

Дзень вызвалення Кубы.

Я — з вострава Свабоды

— Раней у нас гаварылі: хто ўбачыць у сне мора, яснае і глыбокае, той будзе шчаслівы. Людзі верылі ў сон аб моры. Рэвалюцыя прынесла нам шчасце на яве.

Рубэн дэль Тора Дэніс успамінае тыя дні, стаўшыя старонкамі падручнікаў гісторыі, калі паўстанцкая армія Фідэля Кастра пры падтрымцы народных мас змяла супраціўленне войск Баціста. Рубэну было 14 год. Цяжка жыла яго сям'я. Бацька, муляр, пастаянна шукаў работу, пераязджаў з аднаго сялення ў другое. Яго лёс паўтараўся ў лёсе сына. Толькі пяць класаў скончыў Рубэн і пайшоў працаваць, здабываць свой хлеб. Але як не хацелася мірыцца з убогім існаваннем паўраба! Дзед Рубэна неяк расказаў унуку аб тым, чаго не пісалі газеты Баціста,— аб свабодным шчаслівым народзе Савецкага Саюза, аб новым грамадстве краін сацыялізму. З яго вуснаў пачуў падлетак імя Леніна. Дзед тайна ад паліцыі хаваў дома кнігі Маркса, Энгельса.

Прыстанішчам дэль Тора стаў гарадок Моа. Тут, у раёне гор С'ера-Маэстра, нараджалася рэвалюцыя, збіраліся яе сілы. Сям'я, чым магла — адзеннем, медыкаментамі,— дапамагала рэбельдас — паўстанцам, хаця сама жыла ўпрогаладзь. Усё часцей прыходзіў дадому без грошай бацька — удзельнічаў у забастоўках працоўных, дэманстрацыях. Сам Рубэн хацеў збегчы да рэбельдас.

Наступіла 1 студзеня 1959 года. Мары працоўнага народа Кубы сталі рэальнасцю. Кубінская рэвалюцыя ўвянчалася нараджэннем першай сацыялістычнай краіны ў Амерыцы.

— З вялікай радасцю зноў пераступіў я школьную прыступку, адкрыў падручнік. Згаладаўшыся па вучобе, адразу, за чатыры гады, асіліў праграму шасці класаў. Для мяне, Рубэна дэль Тора Дэніс, Рэвалюцыйны ўрад прыняў закон аб нацыяналізацыі адукацыі, увёў бясплатнае навучанне.

Ап'яняла паветра свабоды, атмасфера чалавечай годнасці, народжаная сацыяльнай справядлівасцю і сапраўднай роўнасцю паміж людзьмі.

З усёй страсцю юнацкага энтузіязму рынуўся Рубэн у вір падзей — рэвалюцыйных пераўтварэнняў краіны. Ён стаў членам Саюза маладых камуністаў Кубы.

1961 год быў аб'яўлен у рэспубліцы «годам адукацыі». У масавай кампаніі па ліквідаванню непісьменнасці сярод даросłага насельніцтва краіны ўдзельнічаў і Рубэн: у вёсцы Сан-Антоніа дэль Сур вучыў гуахіра — сялян — лічыць і пісаць. Контррэвалюцыя спрабавала сарваць кампанію. У некаторых месцах членаў брыгад ліквідавання непісьменнасці праследавалі ўзброеныя банды. Разам з народнай міліцыяй брыгадысты знішчылі бандытаў.

У 1964 годзе Рубэн паступіў у Гаванскі універсітэт. З усіх навук выбраў хімію.

— Студэнцкія гады — самыя шчаслівыя ў маім жыцці. Я вучыўся, быў старастай вучэбнай групы, кіраваў атрадам студэнтаў у час сельскагаспадарчых работ. Мы рубілі трыснёг, збіралі плады кофе, па вечарах пелі і танцавалі... Іменна ў час студэнцтва я пазнаёміўся з рускай і савецкай літаратурай, з Чэхавым і Дастаеўскім, з Горкім і Маякоўскім. Памятаю, як прагна ўчытваўся ў радкі рамана Максіма Горкага «Маці», параўноўваў падзеі рускай і кубінскай гісторыі. Але самымі дарагімі для мяне сталі кнігі чалавека, які аддаў шмат сіл, розуму і энергіі, каб усе людзі працы былі шчаслівыя, каб кожнаму быў адкрыт доступ да ведаў. Ленін... У маёй рэспубліцы імя Уладзіміра Ільіча свяшчэннае. Яго носяць шматлікія навучальныя ўстановы, заводы і паркі.

Рубэн марыў аб паездцы на радзіму Леніна, шмат чытаў аб Савецкім Саюзе. Яму хацелася бачыць сваю рэспубліку такой жа магутнай. Атрымаўшы вышэйшую адукацыю, ён стаў выкладаць хімію ў Камагуэйскім універсітэце. Быў тут адным са стваральнікаў факультэта прыродазнаўчых навук, прыняў на сябе паўнамоцтвы дэкана факультэта. І як зайздросціў сястры Нэльбіі, калі яе паслалі вучыцца ў СССР, у Беларускі політэхнічны інстытут. А праз тры гады быў у Мінску сам. Здзейснілася зусім заканамерная падзея: Камагуэйскі і Беларускі універсітэты пасябравалі. Рубэн дэль Тора Дэніс стаў першым аспірантам з Камагуэя ў БДУ.

Пасланца дружалюбнай Кубы цёпла сустрэлі на кафедры аналітычнай хіміі. Год работы ў лабараторыі кафедры быў для яго годам ведаў, годам дружбы.

— Камагуэй і Мінск раздзяляюць дванаццаць тысяч кіламетраў. Але я не адчуваю гэтага. Дружба нашых народаў настолькі трывалая, што Камагуэй заўсёды побач з Мінскам.

Я вучуся з вялікім жаданнем, каб у будучым выканаць задачы, якія ставіць перад маладым пакаленнем наш Рэвалюцыйны ўрад.

Н. НІКОЛІЧ.

Вялікі інтарэс выклікала ў студэнтаў журфака работа беларускіх кінематаграфістаў, якія здымалі на факультэце фрагмент новага мастацкага фільма.

Фота В. ДРАЧОВА.

ШАХМАТЫСТ

На механіка-матэматычным факультэце адбылася сустрэча па шахматах паміж супрацоўнікамі і студэнтамі факультэта. На турніры добра выступілі В. Пчэльнік, А. Кілбас, С. Амельнік і іншыя. Сёння мы раскажам пра аднаго з удзельнікаў шахматнай баталіі Г. Кушкарова.

— Зразумела, магу стаміцца ад клопатаў, ад штодзённых спраў, але ад шахмат — ніколі, — гваорыць Г. Кушкараў, студэнт III курса мехмата. — Многія людзі сцвярджаюць, што шахматы — гэта не толькі спорт, але і школа жыцця. Гэта так.

Першы поспех прыйшоў да Кушкарова два гады назад, калі ён заваяваў кубак на першынстве г. Мінска.

Яшчэ нядаўна яму не хапала ў спорце нярвовых сіл. У напружанай сітуацыі хутка стамляўся і дапускаў сур'ёзныя памылкі. Але ўпартай трэніроўкай гэты недахоп ліквідаваў і цяпер стаў сапраўдным спартсменам-байцом. Лічыць: самае галоўнае — пазнаць сябе. Не адзін самы таленавіты педагог ці трэнер не зможа зрабіць таго, чаго ты сам моцна не захочаш.

...Атака ідзе за атакай. На твары — кропелькі поту. Чуваць, як гадзіннік адстуквае апошнія хвіліны гульні. І толькі ўпартая праца і кемлівасць прыносяць добры вынік.

А. МАРЧУК.

МАРОЗ І СОНЦА — ДЗЕНЬ ЦУДОЎНЫ

Разбуджаныя сосны шапацяць сваімі заснежанымі верхавінамі. Лясная цішыня парушана вясёлымі галасамі.

Тут, непадалёку ад Мінска, ля станцыі «Зялёнае», пачынаюцца лыжныя спаборніцтвы. Лыжнікі правяраюць умацаванні, чуюцца перадстартавыя пажаданні...

І вось старт. Адна за другой ідуць па трасе ўдзельніцы гонкі на адзін кіламетр.

Пакуль лыжніцы спаборнічаюць за лідэрства, мы вырашылі пагутарыць са спартінструктарам, членам мясцкома універсітэта, суддзёй спаборніцтваў У. Р. Кукліным.

— У гэтых спаборніцтвах удзельнічаюць людзі рознага ўзросту,— падкрэслівае ён.— Сёмая спартакіяда БДУ праходзіць пад дэвізам «Здароўе!». Але лыжныя гонкі — гэта толькі другі яе этап. Першым этапам была стральба. А напярадзе яшчэ нялёгкая барацьба па 12 відах спорту.

...Тым часам лыжніцы набліжаюцца да фінішу. Нягледзячы на складанасць трасы (крутыя ўзгоркі, нечаканыя павароты), лыжніцы паспяхова пераадольваюць дыстанцыю. Лепшы вынік у Л. А. Русак. За некалькі хвілін да старту яна гаварыла нам, што вельмі захапляецца лыжным спортам, што прабегчы па лыжні, і асабліва ў такое цудоўнае, сонечнае надвор'е, як сёння, адно задавальненне.

— Сапраўды так! — падтрымаў Людмілу Ананьеўну старшы інжынер кафедры радыяцыйнай хіміі А. В. Паўлаў, які раней неаднаразова выступаў за зборную БДУ.— Я б праводзіў такія спаборніцтвы кожны тыдзень. Галоўнае — не прызы, а актыўны адпачынак на свежым паветры. Гэта вельмі карысна, асабліва для хімікаў.

— Мужчыны, удзельнікі гонкі на 5 кіламетраў! Падрыхтавацца да старту! — пачуўся загад галоўнага суддзі спаборніцтваў В. І. Кашыцына.

5 кіламетраў — дыстанцыя немалая. Каб прайсці яе паспяхова, лыжнік павінен быць выносłівым, добра хадзіць на лыжах, умець размяркоўваць свае сілы.

Сціхлі галасы... Чаканне старту цягнецца некалькі хвілін. Рукі ў нервовым напружанні сціскаюць лыжныя палкі. Старт! Лыжнікі адзін за другім знікаюць за першым паваротам. Секундамер няўмольна адлічвае секунды, мінуты...

І вось на фінішы пераможца — В. Лабуноў, інжынер вылічальнага цэнтра. Яго вынік— 22 мін. 40 сек. За ім — калега з ВЦ В. Васюк. Трэцяе месца дасталося А. Паўлаву.

...Апошнія ўдзельнікі гонкі перасеклі фінішную мяжу. Суддзя падлічвае ачкі.

Такім чынам, на першым месцы каманда вылічальнага цэнтра БДУ. За ёй — каманда хімфака і ФПМ.

Спаборніцтвы закончыліся. Спартсмены задаволены: кожны лыжнік атрымаў сёння цудоўны настрой і зарад бадзёрасці на ўвесь тыдзень.

А. МАЗАНІК,
В. ПЛАТНІЦКІ.

Люблю захапляцца

Адзін увесь вольны час аддае кіно, другі — футболу ці хакею. Захапленне... Ці перашкаджае яно студэнту добра вучыцца? І ўвогуле, што дае так званае хобі чалавеку — адпачынак і толькі?

Слова студэнту III курса гістарычнага факультэта Ігару Велічанскаму.

— Лічу, што захапленні не толькі не перашкаджаюць вучобе, а наадварот, садзейнічаюць гэтаму. Яны дапамагаюць станаўленню чалавека, раскрываюць яго характар, даюць магчымасць пазнаць самога сябе.

З першага курса я займаюся фехтаваннем. Раней мне не прыходзілася сутыкацца блізка з гэтым відам спорту. А цяпер я маю першы разрад, думаю стаць кандыдатам у майстры спорту.

Чаму іменна фехтаванне? Гэта дынамічны від спорту. Ён патрабуе не механічных рухаў, а абдуманых, дакладных дзеянняў. Спалучэнне інтэлектуальнай працы з фізічнай — вось чым вабіць мяне фехтаванне. Каб перамагчы — трэба думаць.

Захапляюся я і літаратурай. Чытаю ўсё, але перавагу аддаю фантастыцы. Калі раней многія лічылі фантастыку пустой выдумкай, то сёння яна прызнана рэальнай. Браты Стругацкія, Барыс Яфрэмаў і іншыя савецкія фантасты паказалі ў сваіх творах будучага чалавека камуністычнага грамадства. Гэта тэма па-сапраўднаму хвалюе мяне як гісторыка і як чалавека.

На мой погляд, сучасны адукаваны чалавек не можа абмяжоўвацца якой-небудзь працай, забываючы пра ўсё астатняе. Ён павінен быць усебакова развітым, цікавым чалавекам.

Запісала Г. МАЛАХОЎСКАЯ.

Учора, роўна ў 19-10 вечара студэнты механіка-матэматычнага факультэта зафіксавалі ля юрыдычнага корпуса на снезе сляды **Снежнага чалавека.** Сляды мелі дакладныя контуры і агульную накіраванасць у бок да вакзала. Шырыня і даўжыня стапы **Снежнага чалавека,** калі меркаваць па адбітку на снезе, адпавядалі 51 памеру мужчынскіх чаравікаў. На пятках ясна прагледжваліся падкоўкі. Візуальны агляд паказаў, што чалавек некуды спяшаўся, бо вельмі часта перабіраў нагамі і намерам пранік ва універсітэт і нешта з яго выносіў, але, злыдзень, ашукаўся з брамкай і быў вымушан аднесці ўкрадзеныя рэчы назад.

Мы ж мяркуем, што паяўленне **Снежнага чалавека** ва універсітэцкім гарадку абумоўлена цягай першага да ведаў, да навукі. З другога боку, гэты факт не крымінальны, а, хутчэй, фрэналагічны, і азначае ён, што 1978 год будзе вельмі снежны.

Са снегам вас, таварышы!

КАФЕДРА.
(Дзесяць подпісаў).

СЕНСАЦЫЯ!

нешта нёс, яго ступні грузна вязлі ў снезе.



Студэнты мехмата выказалі здагадку, што **Снежны чалавек** зайшоў на тэрыторыю універсітэцкага гарадка, спадзеючыся праз заднюю брамку выйсці прама на вакзал (з ім жа былі і чамаданы), але, небарака, ён не ведаў, што брамка даўно і надзейна зачынена на замок.

Работнікі адміністрацыйна - гаспадарчай часткі западозрылі, што **Снежны чалавек** са злым

ХРОНІКА

НАВУКА І ЖЫЦЦЁ

Цудоўнае жыццё стварыў сваёй жонцы доктар эканамічных навук К. Хлюпаў.

ДЛЯ ВАС, СТУДЭНТЫ!

Вялікі клопат аб жыхарах новага інтэрната праяўляюць будаўнікі універсітэцкага гарадка ў Шчомысліцах. У выпадку страты ключа студэнтам не давядзецца ўзломваць дзверы. Дастаткова пазычыць ключ у суседзяў.

ДВА БОТЫ — ПАРА

Такога здзіўляючага выдатнага выніку дабіліся працаўнікі мясцовай абутковай фабрыкі.

КАРЫСНАЯ ПАРАДА

Захоўвайце грошы ў ашчаднай касе!

МАЛАДОЙ МАЦІ

Ваша дзіця пачне гаварыць раней, калі карміць яго вермішэллю «Алфавіт».

ГЭТА Ж ТРЭБА!

Усяго за два гады загадчык сталовай Сяўрын пабудаваў на беразе Чорнага мора двухпавярховую дачу. «Залатыя рукі», — кажуць яму пры сустрэчы знаёмыя.

ПАДСЛУХАНЫЯ ДЫЯЛОГІ

РАЗМОВА ДЗВЮХ СЯБРОВАК

— І што цікавага ты знаходзіш у хакеі?
— О, каб ты бачыла, як там абдымаюцца і цалуюцца!

НА ЛЕКЦЫЯХ

Прафесар кажа:
— Сёння я адпускаю вас на дзесяць хвілін раней. Выходзьце паціху, каб не разбудзіць студэнтаў у суседніх аудыторыях.

З ЮНАЦТВА НІКУЛІНА

— Ты бачыў, зараз дзяўчына прайшла?
— Бачыў...
— А ты звярнуў увагу, як яна мне ўсміхнулася?
— Звярнуў. Але каб ты ведаў, як я рагатаў, калі ўпершыню цябе ўбачыў!..

Дасье лабаранта Пісулькіна

З МАТЭМАТЫКІ

БАЦЬКІ І ДЗЕЦІ

Аднойчы прафесар матэматыкі І. Даўбня прымаў экзамены ў Пецярбургскім горным інстытуце. На экзамен з'явіўся Эйлер, далёкі нашчадак славутага вучонага Леанарда Эйлера. Прафесар прапанаваў студэнту білет. Той не змог адказаць. Даўбня даў другі білет — вынік той жа. Тады прафесар працягнуў студэнту экзаменацыйную ведамасць і сказаў:

— Будзьце ветлівы, пастаўце тут сабе двойку. У мяне рука не падымаецца рабіць гэта ў адносінах да чалавека, які мае такое вядомае прозвішча.

З ЛІТАРАТУРЫ

ГАНДЛЯР

Французскі пісьменнік Віктор Гюго адправіўся ў Прусію. На граніцы жандарм, запаўняючы анкету, спытаў:

— Чым займаецеся?

— Пішу.

— Я пытаю, чым здабываеце сродкі да жыцця?

— Пер'ямі.

Жандарм запісаў: «Гюго, гандляр пер'ямі».

З МУЗЫКІ

ПА АНАЛОГІІ

Неяк вядомаму нямецкаму піяністу Максу Рэгеру пасля выканання квінтэта Шуберта «Фарэль» быў паднесен кошык з фарэллю. Рэгер, падзякаваўшы, паведаміў паклоннікам, што ў наступным канцэрце будзе выконваць «Менуэт быка» Гайдна.

З ЮРЫСПРУДЭНЦЫІ

РЫЗЫКА

У паштовае аддзяленне аднаго італьянскага гарадка прыйшло пісьмо, адрасаванае... «самаму неразумнаму ад вакату горада».

Доўга яго ніхто не хацеў браць. Нарэшце, адзін з адвакатаў рашыўся. У канверце ён знайшоў чэк на буйную суму і запіску: «А вы не такі неразумны, як думаеце».

КАФЕДРА ТРАКТУЕТ:

Дойти до ручки — сделать предложение, просить руки.

Высокомерный человек — баскетболист.

Час пик — в этот час в городском транспорте не пикнешь.

Бронепоезд — поезд, в котором все места забронированы.

Коварство — кузнечное ремесло.

Отвертка (студ.) — ответ не по существу.

Переносица — подсобная работница.

Портянка — бракованная деталь.

Судопроизводство — кораблестроение.

Штукатур — комедиант, фокусник.

Спец — студент, который спит на лекциях.

Спица — то же жен. рода.

Этажерка — соседка по этажу в общежитии.

Студэнт, пазнай свае радкі!

(З ДОПІСАЎ У РЭДАКЦЫЮ)

«Страшно болела голова, хотелось выть и кусать стенку».

***

«Таня сидит за столом. Костя вошёл. Ноги соскочили, руки—навстречу».

***

«30 пар вачэй уважліва слухаюць выкладчыка».

***

«Аннушка на печке, закуталась в одеяло. Глаза чистые, ясные, красные от слез».

***

«Таня ставит для меня дымящийся чай, как сваренные каштаны».

***

«Кто-то из выступающих назвал студенческие годы лебединой песней человека».

Прапануем Навагодні розыгрыш

Скажыце дзяўчыне, з якой вы сустракаецеся, што вы яе вельмі кахаеце і марыце з ёй ажаніцца.

Потым, калі ваш падман выявіцца, вы абодва весела пасмеяцеся.

ТЭЛЕПАТЫЯ

Ужо гадзіну ён сядзеў над скруткам паперы і думаў. «Быў вечар. У інтэрнаце рыхтаваліся да сну...» — далей нічога не прыдумвалася. Натхнення не было. А тут яшчэ гэты Славік перашкаджае:

— Ты каструлі не бачыў? — пытаецца.

— Адстань!

І навошта ён паабяцаў рэдакцыі напісаць гумарэску!

— А хлеб ёсць? — гэта ўсё Славік не ўтаймуецца.

— Адчапіся, тут не да хлеба...

І раптам — ідэя! Ён хуценька схапіў аловак і запісаў, на яго думку, трапныя словы: «Быў вечар. У інтэрнаце рыхтаваліся да сну. Славік стаяў на кухні, памешваючы вялікім чарпаком суп харчо, які варыўся... у чайніку, і вучыў нямецкі».

«Так, пачатак ёсць», — падумаў ён задаволена.

— Будзь сябрам, прынясі соль, — пачуўся з кухні Славікаў голас.

Ён узяў шклянку, адчыніў дзверы кухні і аслупянеў. Хто казаў, што не існуе тэлепаты?

Славік стаяў на кухні, памешваючы вялікім чарпаком суп харчо, які варыўся ў чайніку, і вучыў нямецкі.

М. ДУБОВІК.



Только фужеры, купленные в ЦУМе (цена 120 руб. за 6 штук), приносят счастье при падении на пол.

***

Сдается комната 4 кв. метра. Принимаются коллективные заявки.

***

Несу вздор. Звонить по тел. 83-27-15.

Новогодние елки, купленные у частников, считаются недействительными.

***

Молодой ученый с женой охотно снимут на праздники нервное напряжение.

***

Куплю подержанный конспект в хорошем состоянии. Звонить вечером. Федя.

З НАСЦЕНГАЗЕТЫ КАФЕДРЫ «ЗНАНИЯ—СИЛОЙ»

Хочаш ведаць, колькі можа дзяўчына вынесці на сваіх плячах? Зазірні ў яе гардэроб.

***

Муж у камандзіроўцы застаўся верны сабе.

***

Сем пятніц на адным тыдні — гэта дрэнна. Лепш бы сем субот.

***

Крысы папярэдзілі капітана, што ў іх вучэбная трывога.

***

У жыцці ён пражыў нямнога, таму і пражыў многіх.

***

Паэт быў яшчэ зусім зялёны, але ўжо дастаткова шэры.



Без слоў...

Рэдактар А. А. ДЗЕРАШ.

НАШ АДРАС 220080. Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.

АТ 21206 Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КПБ. Заказ № 2037.